*С. А. Рэвяка, магістрант БДУКМ*
*Навуковы кіраўнік – І. Я. Клімук,*
*дацэнт кафедры менеджменту СКД,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# ГІСТОРЫЯ ПРАВЯДЗЕННЯ І КАНЦЭПЦЫЯ СВЯТА БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА І ДРУКУ

З гісторыі нам вядомы імены такіх славутых асоб, як Францыск Скарына, Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Мікола Гусоўскі, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Лаўрэнцій Зізаній, чыё жыццё было цалкам прысвечана беларускай кнізе. Ушанаванню гэтых асоб і высокага пісьменства было прысвечана Свята беларускага пісьменства, асэнсаваць культурна-гістарычнае значэнне якога – мэта артыкула.

Упершыню Свята беларускага пісьменства і друку адбылося на пачатку верасня 1994 г. Яго з’яўленне было выклікана падзеямі, якія яму папярэднічалі. Так, у маі 1990 г. на працягу тыдня шырока адзначаўся 500-гадовы юбілей Францыска Скарыны. У Мінску, Маскве, Вільнюсе і іншых гарадах былога Савецкага Саюза, у Акадэміі навук Беларусі, універсітэтах і інстытутах, у розных установах культуры, праводзіліся навуковыя канферэнцыі, Скарынаўскія чытанні, круглыя сталы, школьныя ўрокі і іншыя мерапрыемствы, прысвечаныя ўсходнеславянскаму першадрукару. Яны стварылі высокадухоўную атмасферу, якая актывізавала творчую дзейнасць усяго грамадства. На творчым уздыме працавалі ўсе сродкі масавай інфармацыі, кнігавыдавецтвы. Ажыццяўляліся выпускі альбомаў, кніг, выходзілі спецвыпускі газет. Цэнтрам славянскіх і скарынаўскіх урачыстасцяў быў абраны г. Мінск. Сюды прыехалі вучоныя з усяго Саюза, замежныя госці, сабраліся беларусісты з розных краін.

Праз два гады, у 1992 г. з Ерусаліма ў Мінск быў прывезены Святы Агонь, запалены з Труны Гасподняй. З гэтай нагоды па краіне прайшлі шматлікія ўшанавальныя мерапрыемствы. У 1993 г. былі падрыхтаваны адпаведныя дакументы наконт увядзення Дня беларускага пісьменства і друку. 25 мая 1994 г. быў прыняты адпаведны ўказ, у выніку чаго ў 1994 г. упершыню святкаваўся Дзень беларускага пісьменства і друку. Паколькі Полацк лічыцца самым старажытным горадам на Беларусі і радзімай першадрукара, ён стаў першай сталіцай гэтага свята [4, с. 4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Год | Месца правядзення |
|---|---|
| 1994 | Полацк |
| 1995 | Тураў |
| 1996 | Навагрудак |
| 1997 | Нясвіж |
| 1998 | Пінск |
| 1999 | Орша |
| 2000 | Заслаўе |
| 2001 | Мсціслаў |
| 2002 | Мір |
| 2003 | Полацк |
| 2004 | Тураў |
| 2005 | Камянец |
| 2006 | Паставы |
| 2007 | Шклоў |
| 2008 | Барысаў |
| 2009 | Смаргонь |
| 2010 | Хойнікі |
| 2011 | Ганцавічы |
| 2012 | Глыбокае |
| 2013 | Быхаў |
| 2014 | Заслаўе |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галоўнымі ініцыятарамі і арганізатарамі Свята беларускага пісьменства і друку з'уляюцца Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (наместнік – В. І. Семашка), Міністэрства культуры (наместнік прэм'ер-міністра – Т. І. Стружэцкі, раней – А. М. Косінец), Міністэрства адукацыі (М. А. Маскевіч), Міністэрства інфармацыі, а таксама Праваслаўная царква, прадстаўнікі дыпламатычных місій. Фінансавую падтрымку свята аказвае Нацыянальны банк РБ.

Задачамі свята з'яўляюцца: павышэнне прэстыжу пісьменства і друку як асновы шматвяковай нацыянальнай культуры і ўзмацненне яе ролі ў духоўным жыцці краіны; далучэнне маладога пакалення да культурнай спадчыны беларускага народа; прапаганда беларускай мовы і літаратуры; актуалізацыя культурна-гістарычных асоб, ушанаванне асветнікаў і сучасных мастакоў роднага слова, якія захоўваюць слаўныя традыцыі беларускага пісьменства.

Трэба адзначыць, што у канцэпцыю свята, прысвечанага Дню беларускага пісьменства і друку, закладвалася шматаспектная

дзейнасць творчых сіл, накіраваная на ўсталяванне духоўных традыцый, на ўхваленне велічных спраў нашых папярэднікаў. Само свята разгортваецца на розных ўзроўнях і ў розных аспектах. Амаль тыдзень доўжыцца навукова-творчая экспедыцыя «Дарога да святыняў», арганізацыяй якой ўжо шмат гадоў займаюцца работнік культуры Ларыса Бондарава і паэтэса Ніна Загорская, якая і прапанавала ўключыць экспедыцыю у канцэпцыю свята [4, с. 6].

Праграма святкавання ўключае правядзенне інфармацыйнага тыдня па адпаведнай тэматыцы, мерапрыемствы мастацка-гістарычнай накіраванасці, дабрачынныя акцыі, прэзентацыі беларускіх выданняў, фестывалі дзіцячай і маладзёжнай прэсы, сустрэчы-дыскусіі, круглыя сталы вучняў і педагогаў з дзеячамі культуры, паэтамі, работнікамі выдавецтваў, журналаў і г. д.

Для папулярызацыі беларускай кніжнай спадчыны ў ходзе правядзення свята выкарыстоўваюцца разнастайныя арганізацыйна-мастацкія сродкі. Пра гэта яскрава сведчыць праграма ў Паставах трынаццатага па ліку свята. У праграму правядзення свята ўваходзілі навукова-практычная канферэнцыя «Пастаўскія чытанні», адкрыццё помніка Канстанціну Тызенгаўзу, адкрыццё Дома культуры, святочная літургія, пасадка Саду Малітвы, розныя канцэрты. Асаблівае ўражанне пакінула цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў 46 Рэспубліканскага конкурсу «Мастацтва кнігі» прэміяй «Залаты фаліянт». Праходзілі экспазіцыі друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, конкурсы, латарэі.

Да Дня пісьменства праяўляюць вялікую цікавасць дыпламатычныя місіі, што працуюць на Беларусі. За тыдзень да свята на ўдзел падалі заяўкі кіраўнікі і прадстаўнікі цэлага шэрагу пасольстваў: Расіі, Украіны, Балгарыі, Арменіі, Казахстана, Кубы, Сербіі, Таджыкістана, ЗША, Канады, Індыі і інш. Лічыцца, што наведаўшы гэтае свята, можна за кароткі тэрмін сфармаваць аб'ёмнае ўяўленне пра нашу краіну, пра ментальнасць, культуру і традыцыі яе жыхароў [1, с. 3].

Пры правядзенні свята ў Паставах быў адкрыты павільён «Сучасная беларуская кніга» з выстаўкамі кніг беларускіх выдавецтваў , кніг-лаўрэатаў 46 Рэспубліканскага конкурсу «Мастацтва кнігі», кніг серыі «Віцебшчына: гісторыя і сучаснасць», а таксама павільён «Скарбы беларускага кнігадрукавання». Працавалі тэматычныя кніжныя пляцоўкі («Планета дзяцінства», «Шлях да ведаў», «Пісьменнік, час, эпоха…», «Люблю цябе, Беларусь»), фотавыстаўкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Толькі за шэсць месяцаў 2006 г. на Беларусі было выпушчана больш за 6,5 тысяч найменняў кніг і брашур агульным тыражом 28,7 мільёна экземпляраў. Увагу трэба звярнуць на тое, што айчынная кнігавыдавецкая прадукцыя распаўсюджваецца таксама за межамі нашай краіны [1, с. 4].

Свята злучае ў сабе рысы гістарычнага свята і своеасаблівую літаратурна-выдавецкую формулу. Правядзенне яго ў невялікіх гарадах і мястэчках спрыяе развіццю сацыяльнай інфраструктуры апошніх, прыцягвае да іх увагу кіраўніцкіх структур, грамадскасці і мастацкіх колаў [3, с. 120].

Запатрабаванасць і прывабнасць для ўсіх слаёў беларускага насельніцтва Свята беларускага пісьменства і друку заключаецца ў тым, што яно вызваляе з забыцця славутыя імёны беларускіх першаасветнікаў, чыё жыццё стала прыкладам служэння Слову, адыгрывае значную ролю ў захаванні і развіцці кніжнай стадчыны; павышае прэстыж пісьменства і друку як асновы беларускай нацыянальнай культуры; далучае маладое пакаленне да культурнай спадчыны беларускага народа. Яно становіцца імпульсам для ажыццяўлення выхаваўчай работы, накіраванай на грамадзянска-патрыятычныя і ідэйна-маральныя якасці асобы.

Кожны год свята вызначаецца чымсьці новым, адметным, звязаным з гісторыяй і традыцыямі таго рэгіёну, дзе яно ладзіцца. Істотна, што сталіца свята і яе ваколіцы абнаўляюцца і творча абуджаюцца. Гаспадары рупліва рыхтуюцца, каб найлепшым чынам прыняць шматлікіх гасцей. Асноўны арганізацыйны цяжар прыходзіцца на Міністэрства інфармацыі і мясцовыя органы кіравання, потым да іх далучаюцца іншыя міністэрствы і ведамствы, творчыя арганізацыі і ўстановы. Свята пісьменства становіцца добрай нагодай для дэманстрацыі дасягненняў айчыннага друку і разваг пра цяперашні яго стан.

«Дзень беларускага пісьменства за дваццаць гадоў правядзення стаў сапраўдным нацыянальным святам духоўнасці і культуры» – даў высокую адзнаку гэтаму святу міністр культуры Б. У. Святлоў. І мы згодны, што праект прыцягвае ўсё больш увагі не толькі саміх непасрэдных удзельнікаў, але і пасіўных назіральнікаў. Дзякуючы гэтай падзеі, кожны год зменьваюцца, набываюць сучаснае аблічча невялікія гарады і райцэнтры, адраджаюцца помнікі гісторыі, архітэктуры і культуры [2].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Свірын, І.* Энергія нацыянальнага слова / І. Свірын // Культура. – 2006. – 2–8 верас. – № 36. – С. 3–4.

2. Свята духоўнасці і культуры / БелТА // «Жыццё Палесся» мазырская грамадска-палітычная газета [Электронны рэсурс]. – 2014. – Рэжым доступу: http://www.mazyr.by/2013/09/prazdnik-duxovnosti-i-kultury. – Дата доступу: 05.03.2013.

3. *Сівурава, Л. П.* Фестывальная дзейнасць як фактар захавання і развіцця культуры ў рэгіёнах Беларусі / Л. П. Сівурава // Повышение роли клубных учреждений в социокультурной жизни регионов : материалы Респ. науч.-практ. конф., Минск, 22–23 нояб. 2006 г. / БелГИПК. – С. 116–123.

4. *Шавыркін, М.* Свята роднага слова / М. Шавыркін // Наша слова. – 2005. – № 3. – С. 4–6.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*П. М. Сапотько, магистрант БГУКИ*
*Научный руководитель – А. И. Смолик,*
*заведующий кафедрой культурологии,*
*доктор культурологии, профессор*

## ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ОБЩЕСТВЕННЫХ КУЛЬТУРНЫХ ФОНДОВ БЕЛАРУСИ ПО ВОЗРОЖДЕНИЮ МАТЕРИАЛЬНОГО ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ СТРАНЫ

Множество проблем в сфере культуры Беларуси на современном этапе лежат в плоскости охраны материального историко-культурного наследия. Согласно статье 4 Закона Республики Беларусь «Об охране историко-культурного наследия» от 9 января 2006 г. № 98-З, «общественные организации в сфере охраны историко-культурного наследия могут оказывать государственным органам содействие в реализации государственной политики в данной сфере, популяризировать историко-культурные ценности, осуществлять общественный контроль за соблюдением законодательства Республики Беларусь об охране историко-культурного наследия, способствовать формированию у граждан патриотизма, ответственности за сохранение историко-культурного наследия, осуществлять иную деятельность, не запрещенную законодательством Республики Беларусь» [2].

Невзирая на сравнительно небольшой период своего существования, белорусскими общественными культурными фонда-